# ЛЕПШЫ ГОРАД ЗЯМЛІ

Зборнік літаратурна-мастацкіх твораў
да 895-годдзя горада Гродна

## Людміла КЕБІЧ

### *Лепшы горад*

Перабіраю ў думках гарады,
куды б аднойчы з’ехаць захацела
ад спраў бясконцых, стрэсаў і нуды,
ад стомленасці і душы, і цела.

Так хочацца, бывае, уцячы
са звыклага жыццёвага раскладу
туды, дзе ты самотны, ты – нічый,
нікому не патрэбны і не рады.

Венецыя? – Але там шмат вады.
Парыж? – Была, ды ён занадта шэры.
Рым – вельмі вечны, мне чаго туды?
І ў Вене недахопаў бачу шэраг.

Сябе на думцы зноў і зноў лаўлю,
што з’ехаць аніколі не збяруся,
бо толькі Гродна ўсёй душой люблю –
куточак унікальны Беларусі.

Тут буду адбіваць свае сляды,
жыць радасна, пявуча, светла, годна…
Мне іншыя навошта гарады,
калі на карце свету ёсць мой Гродна.

## *Пакуль бягу*

Гродна, я ўрасла ў твае завулачкі,
у бульвары,  плошчы і сады.
Адкушу будзённай крохкай булачкі
і бягу праз іх цераз гады.

Тут за што пaглядам ні зачэпішся,
у напеўны просіцца радок.
Тут жыву здавён, і сэрца цешыцца,
што маёй тут творчасці выток.

Тут прабегла Маладосці станцыю,
дзе надзеі, воля, інстытут…
Дзе каханне белаю акацыяй
бласлаўляла кожны мой маршрут.

Тут брыла між Сталасці прыпынкамі:
праца – дзеці – дом – сябры – сям’я…
Шчырымі памкненнямі, учынкамі
там і застануся, пэўна, я.

А пакуль што галубамі белымі
ўспаміны пырхаюць з-пад ног,
ды ўнукі ягадамі спелымі
коцяцца ў жыццё цераз парог.

А пакуль бягу па родных вулачках…
Горад мой, які ж ты малады!
Тут сваю абгрызеную булачку
раскрышу я  птушкам без жальбы.

## *Над Швейцарскай далінай*

Над Швейцарскай далінай – восень.
Над узгоркам яшчэ зялёным
гонкі вецер крычыць-галосіць:
– Лісце скінулі клёны!

І ляжыць яно жоўтай плямай,
на шляху ў небыццё паўвыйсцем,
а высока – качыны лямант:
– Клёны скінулі лісце!

Пешаходы спяшаюць міма…
Непрыемная воку з’ява:
клёны ў чорных убраннях міма –
адыходу выява.

Нават рэчка – калыска мары,
плешча ў неба – недаглядзелі?! –
не прымаючы кошт ахвяры:
яшчэ ўчора ірдзелі!

І бяры не бяры ў двукоссе
той пагорачак нескароны,
напаўжоўты, напаўзялёны
ці вятроў шматгалоссе,

ды не спыніш ужо і ў парфорсе
час ападу замглёны.
Над Швейцарскай далінай – восень:
лісце скінулі клёны.

## *У Гародні – фестываль*

Расцвіла прыгажуня Гародня,
старажытная і маладая,
як нявеста, шчаслівая сёння –
– фестывальных гасцей сустракае.

Ярка ззяе мастацтваў паходня,
зноў сяброў запрашае на баль.
Урачыста святкуе наш Гродна
свой дванаццаты ўжо фестываль.

І мацнее сяброўства,
і край наш цвіце,
прыгажэе наш горад
ад любові народнай.

І далёка па свеце
Нёман вестку нясе:
у надзейных руках
наша спадчына родная.

## *Цюльпаны*

Час не дарэмна скарыстаны:
мінаю наш універмаг,
а ля яго – гарой цюльпаны,
у банках, вёдрах, на сталах…

З чаго яны? З вясновай пены?
Пяшчоты сонечных вышынь?
І ўжо пяюць, звіняць катрэны
маёй абуджанай душы.

Бяру шчасліва, як каханне,
як сэнс жыцця, як цэлы свет,
як сімвал весніх спадзяванняў
на лепшы лёс, жывы букет.

З вялікай вераю святою:
раскрые кожны свой бутон.
Цюльпаны пахнуць навіною,
яны – мой весні камертон.

## *Па зімовым горадзе*

Правязі мяне, сынок,
па зімовым горадзе,
мне б убачыць хоць разок
прадсвяточны Горадзен.

Прэсны выдаўся дзянёк,
не хапае соладу,
глеба выплыла з-пад ног,
сэрца поўна холаду.

А ў неонавым святле
ноч – прыязна-ветлая,
беляхціць сняжок на шкле,
як усмешка светлая.

Гарадскія ліхтары –
пальмы між таросамі,
і мароз, як дзед стары,
крэкча пад калёсамі.

Абалье мяне з каўша
цішынёй Мядзведзіца,
і адталая душа
заблішчыць-засвеціцца.

## *Каложскі парк*

Каложскі парк у восеньскай дрымоце,
салодкай, развітальнай да слязы,
паслаў пасцель з кляновага ашмоцця,
бярозавай і іншай драбязы.

Каложскі парк у светлым прадчуванні,
што здзейсняцца яго надзеі-сны,
ён кожным голым дрэўцам у чаканні
зялёнай, белакрылае вясны.

Каложскі парк… Ні следу ад самоты.
Які спакойны, годны адыход!
Вятры схавалі гучныя фаготы
да будучых і больш вясёлых нот.

Каложскі парк – тут храм Барыса-Глеба,
тут Нёман мірна плешча ў берагі.
І гэтак многа нада мною неба,
і ні драбінкі восеньскай тугі.

## Спіць Гародня

Спіць Гародня над сінім Нёманам,
Сніць Гародня шчаслівы сон.
Нават птушкі вясёлым гоманам
не трывожаць начны азон.

Спіць Гародня пад небам сцішаным,
Сніць Гародня лясны мурог,
дня працоўнага пульс узвышаны,
сто вяртанняў са ста дарог.

Замірае, амаль не дыхае,
астывае жыцця імпэт,
як дзяўчо паслухмяна-ціхае
зіхатліваю зоркай пырхае –
у паднебны плыве Сусвет.

## Свята музыкі

Над Гародняй рыгадоны,
паланэзы, менуэты
льюцца з кожнага балкона
ў сэрца чулае паэта.

Свята музыкі ў Гародні,
і сучаснай, і класічнай,
трубы ззяюць, як паходні,
у аркестры сімфанічным.

А фаготы і трамбоны –
на тры tutti,  так магутна,
бы з нябеснага амбона
слова Госпада ў дзень судны.

Ды здымаюць, як рукою,
кульмінацыю гуляння
скрыпкі, флейты і габоі –
светлы момант даравання!

Пастаяць у захапленні
пад балкончыкам барочным –
непаўторныя імгненні,
незабыўны дзень святочны.

## Горад-казка

Ланцужкі сцяжынак родных
хай вядуць мяне заўжды
ў мой славуты горад Гродна,
дзе вякоў сівых сляды.

Дзе амаль на кожным доме –
шыльды ў гонар землякоў.
Гродна ў свеце стаў вядомы
праз руплівцаў-мастакоў,

праз вучоных і паэтаў,
што ўслаўлялі родны край.
Гродна мае твар адметны,
горад – казка, горад – рай.

Сіні Нёман – бацька родны,
а Каложская царква
стала маці яму, Гродна
праз стагоддзі зберагла.

Мне ў тваіх абдымках шчырых
так утульна, горад мой,
мо таму шчыруе Ліра –
слоў прызнання тчэ сувой.

Мо таму здалёку рвуся –
дакарай не дакарай –
у гасцінны, беларускі,
Прынямонскі любы край.

## *Афганскі парк*

Пайду, пагуляю па парку Афганцаў,
да помніка кветкі ўскладу.
Ад чорнага гумару, песень і танцаў
мо там дзе зацішак знайду.

Як выраслі любыя воку бярозы!
Адну з іх садзіла і я.
Бабулькі на лаўках сядзяць, як мімозы,
і слухаюць спеў салаўя.

У штучным азерцы – і смецце, і качкі,
іх печывам корміць дзятва.
Малеча на траўцы ганяецца ў мячык,
і шмат тут цяпла і святла.

А я ўспамінаю: люляла ў калысцы
сыночка свайго, траццячка.
Ён першыя крокі зрабіў тут калісьці,
наперад – па ямках, сучках…

Тут некалі хутар, напэўна, быў чыйсьці,
звісалі плады да зямлі.
Было тут зацішна, цяніста і чыста,
і дзеці ў тым садзе раслі.

Прысела на хвілю – зляцеў, як клубочак, –
адважныя тут галубы.
Які ты прыгожы, зялёны куточак,
ад дома ў ста кроках хады.

Царква купаламі на сонейку ззяе,
і можна злавіць вяршапад.
Шкада – не заўсёды мне часу хапае
наведаць Афганскі парк-сад.

## *Выстава ў Новым замку*

Пачатак дваццаць першага стагоддзя.
Выстава гарадзенскіх мастакоў.
Што талентаў багата ў прыродзе,
Мы ведаем гісторыі спакон.

Шэдэўраў шмат пабачыў Замак Новы –
Бяжыць, імчыць жыццёвая рака…
Паэт дакладнага шукае слова,
Мастак – таго адзінага мазка,

Які кладзецца на зыходзе ночы
І поўніць працу сэнсам і святлом,
Які не дасць на момант змежыць вочы, –
Дык варажы над шэрым палатном!

Хто раз спазнае творчасці спакусу,
У свет чароўных фарбаў заплыве,
Той век належыць будзе Белай Русі,
Якая так натхняе, бо жыве!

# *Гарадзенскія радкі*

**1**

Трасціначка над Нёманам
вятрамі не зламаная,
нацятая, здранцвелая,
але не зашуганая.
Як Гродна, непахісная
перад пагрозай студзеня,
яна апошняй рыскаю,
такой празрыста-рудзенькай,
дамалявана пендзлем
зімовай стромкай раніцы.
І застанецца вензелем
да лета ў маёй памяці.

**2**

Над соннаю Гародняю – цыклон,
як прывід Фары Вітаўта ўначы.
Ён крылы чорныя па небе распасцёр,
спалохана замоўклі крумкачы.
Мяцеліца на вулках сцеле бель,
сама з сабой танцуе падыспань.
Гісторыі рыпучай карусель
над гэтым горадам ляціць бы здань.
Пад жэрлам бронзавых гарматаў курганкі
каменных ядраў, што спыніць маглі
варожы наступ з сушы і ракі,
і толькі здрады не перамаглі.

# *Туман над Гародняй*

*Людміле Кебіч*

Туман злучыў раку і неба,
ахутаў пасмамі дубы.
А мы гулялі без патрэбы,
Ішлі няведама куды.
Далёка ад інтрыг і плётак,
ад нагавораў, здрад, маны.
Тут толькі плёскат сонных плотак,
чый хвост схавалі туманы.
Пужлівых качак піруэты,
лістоты тленне ўздоўж сцяжын,
і голас гродзенскай паэткі –
у нас з ёй лёс амаль адзін.
Яна, як я, сумуе творча
і наталіць не можа слых
асенняй цішаю, што крочыць
маўчаннем ля дубоў старых.
А я каля Каложы ўкленчу.
Тут месца сілы – мой прэлюд.
Барыс і Глеб сюды на веча
склікалі хрысціянскі люд.
Давай памолімся з табою
за горад гэты і за край.
Няхай туманам над ракою
сплывае сум за небакрай.

## Гродна – гучыць ганарова

Гродна – гучыць ганарова,
З ім парадніўся мой лёс,
І пра яго мае слова
Нёман на хвалях панёс.
Тут мае дні маладосці
П'юць з яго чыстых крыніц
І запрашаюць у госці
Песняй дзяўчат-гараднiц.
А фестываль запрашае
Бліжніх і дальніх сяброў,
Кожны, хто тут пабывае,
Марыць вярнуцца ізноў.
Гродна ў вяках знакаміты,
І знакаміты ў наш час,
Чысты, прыгожы, адкрыты –
Самы найлепшы для нас.

## Зорка над Гродна

Святая Каложа
Заўжды дапаможа,
Хто прыдзе сюды памаліцца,
Душою сагрэцца
І ўсім сваім сэрцам
Адзінаму Богу адкрыцца.
І Бог супакоіць,
І раны загоіць –
Збалелыя раны на сэрцы,

І выйдзеш з палёгкай,
Упэўненым крокам,
І сонца табе ўсміхнецца.
Маліліся тут
І князі, і княгіні,
І простыя моляцца людзі.
Каложа – святыня
У вяках не загіне
І зоркай над горадам будзе.
Святая Каложа
Заўжды дапаможа,
Хто прыдзе сюды памаліцца,
Душою сагрэцца
І ўсім сваім сэрцам
Адзінаму Богу адкрыцца.

фото Коложі

## Браніслаў ЕРМАШКЕВІЧ

# Гродна

Прада мной разнасцежыцца Гродна
да апошняе кроплі знаёмы,
і сівы горда-велічны Нёман,
які стаў для мяне цяпер родным.

Замкі – Новы, Стары – веліч Гродна,
след вялікасці тронных прастолаў.
Вастраверхія дахі касцёлаў
драмтэатрам падкрэслены годна.

І падворкі і цень, прахалода
вузкіх вуліц, сады і суквецці,
і праспекты з каштанамі ў цвеце
зычаць раніцай нам асалоду.

Тызенгаўз паважаны тут правіў,
тут пісала Эліза Ажэшка,
тут свае яны торылі сцежкі –
іх імёны  і сёння мы славім.

Горад, Богам абраны для храмаў
і прытулак для розных канфесій.
Бог адзін. Малітоўнаю песняй
тут загойваюць вернікі раны.

У Пакроўскі Сабор памаліцца
да нас едуць з замежжа народы –
у малітве адводзяць нягоды,
у адзіную рэчку каб зліцца.

Горад справы, дарадчык, рамантык,
прававед, навуковец, гісторык...
Разам з людам і ў шчасці, і ў горы
Ён будуе падмурак гарантый.

Быў і ёсць горад цэнтрам культуры,
у былінах і песнях апеты.
Мастакі яго пішуць з натуры,
прыгажосць услаўляюць паэты.

## *Праспект Кляцкова*

*да 105-годдзя з дня нараджэння Л. Г. Кляцкова*

Зялёным ветрам май невыпадкова
дыхнуў у твар і мякка ахінуў.
Эх, каб жа зноў нам напаткаць Кляцкова,
дык ён ніколі б нас не прамінуў.

Яго цяпер успамінае кожны
хто жыў тады і разам працаваў.
Ён быў і ёсць, нібыта знак дарожны,
уперад вёў, імкнуўся, мацаваў.

Калі б пасля апошняй сваёй кропкі
за думкай пацягнулася  рука,
узбагаціў бы ён айчынную скарбонку,
пакуль цякла яго жыццёвая рака.

Бягуць гады, ды не старэе Гродна,
Імя Кляцкова не зышло ў нябыт.
І радуюся разам я з народам:
Славутае імя яго Праспект набыў.

## *Свята рамеснікаў у Гародні*

Рамеснікаў свята –
у Гародні “Казюкі”.
Дасціпнага жарту
вясёлыя гукі.
Майстры раскладаюць
прыгожа тавары:
– Бярыце на шчасце,
бярыце да пары.
Драўляная лыжка –
пагляньце якая.
Ці пластык варэнне
вам так памяшае?
А гэта лапатка
з найлепшага дуба –
варочаць аладкі
і зручна, і люба!
Тут поруч вязалля
расхваліць работу:
– Купляйце берэцік,
насіце ў ахвоту.
Далей бранзалеткі
і пацерак горы.
– Бярыце, дзяўчаткі,
сабе на ўборы.
Бы ў садзе духмяным,
стаяць мылавары,
бо водарам вабяць
кліентаў тавары.
Дзядзькам з кавалём
гаварыць у ахвоту,

як тут не пахваліш
такую работу.
Ганчар адмыслова
рэкламу трымае –
ён з кубачка каву
ў смак папівае.
А кубачак зграбны,
з прыгожым узорам,
такі падарыць нават
будзе не сорам.
Кірмашык вясёлы,
усмешкі лунаюць –
сардэчна гандлююць,
сардэчна купляюць.
Дасціпныя жарты,
ніякай прынукі.
Рамеснікаў свята –
у Гародні "Казюкі".

## *Каля Фарнага прыпынюся*

Каля Фарнага прыпынюся,
У плыні часу пазычу хвілін,
Бо жыццё наша ў дзён завірусе –
Міг адзін.
Кожны крыж свой нясе, як можа,
Ці як вызначана жыццём...
Нешта радуе, нешта трывожыць –
Мы ідзём.
Як і кірунак наш – "Sursum corda".
Сэрцы ж узнесці ці лёгка нам?
Ці ў бунтоўнасці, ці з пакораю –
Толькі сам.

## *Любы горад*

Мой любы горад, слаўны Гродна,
Заўжды душы і сэрцу родны.
Цябе любоўна мые Нёман
Пад вуліц шум і плошчаў гоман.
Страчала шмат паноў-вяльможаў
Тут праваслаўная Каложа.
Яна – наш сімвал, наша слава.
На гэта мае, пэўна, права.
Твае касцёлы і саборы
Крыжы свае ўзнялі ўгору.
Званы нас цешаць міла звонам.
Святыя моўчкі нам з іконаў
Разумныя даюць парады,
Заўжды сустрэцца з імі рады.
Часцей у святы, нат у будзень
Ідуць у святыя месцы людзі.
Прыгожа ў скверах, люба ў парку.
Цудоўна дзеткам у заапарку
Жывёлін розных там убачыць.
Любіць прыроду будуць, значыць.
Краіны нашай ты фарпост,
Усходу з захадам наш мост.
Людзей у памяць ты заносіш,
У назвах вуліц іх узносіш.
Музеяў шмат, бібліятэк,
Заводаў, фабрык і аптэк…
Табою, Гродна, ганаруся,
Найлепшы горад Беларусі.

## *Любы «Азот»*

Магутны асілак хімічны «Азот».
Надзейна працуюць машыны.
Шануе цябе беларускі народ,
Аплот ураджаеў краіны.

Нам хімікаў свята нясе светлы май.
Яго адзначаем мы годна.
Ты радуй прадукцыяй якаснай край
І любы над Нёманам Гродна.

Патрэбны Радзіме «Азота» плады.
Хаду тваю час не астудзіць,
Бо гонар і славу нясуць праз гады
Твае працавітыя людзі.

Няхай прадаўжаецца хімікаў род.
Няма нам для суму прычыны.
Няхай аб’яднанне расце з году ў год.
Ты флагман заможнай Айчыны.

## *Юбілей «Азота»*

Здаецца, нядаўна быў дзень нараджэння,
А ўжо лічыць час шэсцьдзясят.
Пусціў свае ўшыркі ты цэхі-карэнне,
А за даляглядам шмат свят.

Гудуць і працуюць надзейна машыны,
А якасць – аснова штогод.
Падняў любы Гродна, як сцяг, на вяршыню.
Наш гонар і слава – «Азот»!

Прыпомню ў цянёчку не раз праз гады я
Твой бачны ў гісторыі след.
Напоўняць скарбонку ізноў маладыя.
Ідэі навукі – іх свет.

Нашчадкаў кіруе цяпер пакаленне.
Вялікі наш хімікаў род.
А мы, ветэраны, у храмах калені
Прыклонім, каб жыў наш «Азот».

Прайшла на «Азоце» жыцця палавіна,
А ўсё нібы ўчора было.
Адною сяброўскай жылі мы радзінай.
Мне сябар – як птушцы крыло…

Прыпомняцца цэха начныя мне пускі,
Дзе пуск – гэта шмат мітусні.
Надзейны настаўнік і сябра быў рускі.
Жылі, як браты – без хлусні.

У траўні адзначым мы хімікаў свята,
Паднімем свой келіх-зварот.
Каб мір панаваў у галовах і хатах –
Ты плённа працуй, мой «Азот»!

## *Скарбы Нёмана*

Зямлю стагоддзі Нёман студзіць,
Мастам, Гародні зрэзаў грудзі.
Ваду збірае да драбніц
Вякамі з рэчак і крыніц.

Вадою круцяцца турбіны,
Даруе ток ён для краіны.
Пяску і жвіру з дна рачнога
Намые для  будоўлі многа.

Цягае баржы на спіне,
А скарбаў безліч там, на дне.
І гістарыных шмат падзей
Вадой схавана ад людзей.

Каложы твар вякамі мые
І берагі капае, рые.
Вядзе павольна ён раскопкі
Сваёю хваляй нетаропкай.

Бяжыць вада, ляціць і час,
У даўніну вяртае нас.
Нам экспанаты праз вякі
Пакажа дно маёй ракі.

Вады ў Прыбалтыку вяртанне –
Ад Беларусі прывітанне.
Цябе шануем песняй, вершам.
Для беларусаў слаўны, лепшы.

Азот

## *Утро в городе*

Бризом тихой зари
Вод расседлана качка.
И восход фонари
Погасил на “табачке”.
Свой счастливый улов
В биографию утра
Вновь вписал рыболов
Пером перламутровым.
Чайки белым крылом
Режут с острым азартом
Ломти сочные волн
Рыбке шустрой на завтрак.
Над обрывом крутым,
Как посланница Божья,
Помогает святым
Править службу Коложа.
Красной охрой восток
Тронул фресок палитру.
Душ людских холодок
Лечит словом молитва.
Полотенца колёс
Мокрых улиц трут лица:
Ослепляя до слёз,
След хрустальный ложится.
С хлебзавода волна,
Расплываясь в полнеба,
Напоила сполна
Тёплым запахом хлеба.

Как густой фейерверк
Смех рассыпался лентой:
По Дзержинского вверх
Шли в “аграрный” студенты.
Дух печей заводских,
Что пьянил поневоле,
Ароматом был их
Судьбоносного поля.

## *Ночная сказка*

Там, где солнце спать
ложится,
Там, у западной границы,
Над рекой широкой,
синей,
Многоточьем жёлтых
линий
Город-труженик
усталый
Вновь зажёг огни
кварталов.
Словно вдруг колдун
беспечный
Опрокинул неба
Млечность
И костлявыми руками
Жар рассыпал с угольками.
Фей речных не потревожив,
Поднимусь к святой
Коложе.
Прочной нитью переправы
Сшиты левый берег с
правым,

Тени замка бродят в
залах,
Приоткрыв свои
забрала.
Удивлённо глядя в лица:
“В княжьих комнатах –
партийцы?”
Тихо гаснет свет в
окошках:
Ходит дрёма чёрной
кошкой.
Нёман ткёт до зорьки
поздней
Синий бархат в ярких
звёздах.
Лишь с рассветом ветер
вольный
Мрак закроет в старых
штольнях.
Спрячет крылья ночь –
жар-птица.
Пусть ей сладко-сладко
спится:
Молодых любовью
крепкой
Околдовывать – дар
редкий.
Расстегну рубахи ворот,
Дышит свежестью
наш город.
Лижут волны донный
камень,
Отшлифованный
веками.

Молкнет шум густой и
вязкий,
Погружая город в
сказку,
Город древний,
благородный,
Приграничный город
Гродно.

## *Виражи*

У Коложи тишина:
Дух молитв витает.
Лишь внизу воды струна
С Балтикой играет.
Режет Нёман виражи
Залихватски круто.
Сквозь две линии межи
Прёт в литовский хутор.
Чуть завидую воде:
Вольность-то какая!
А у ив на бороде
Радуга играет.
Жаворонок вьёт витки
Слева и направо.
Видно, тоже у реки
Перенял все нравы.
И над клином рыжим ржи
Песня медью – в росы!
Возвратите, виражи,
Золотую россыпь.

## *У Нёмана*

Пахнут грозами губы землицы,
лезут в волосы пальчики трав,
мне бы силушки только напиться
из зелёных колодцев дубрав.
Ветер с Нёмана юркой рыбёшкой
по лицу щекотнул холодком.
Вздул, как парус, мне ситец одёжки
и в луга убежал босиком.
Опущу я гудящие руки
в рос зеркальных целебный настой:
и такие волшебные звуки
хлынут в сердце волною густой.
Колокольчик в глубоком поклоне
пред глазастой ромашкой застыл.
Синий клёш и такие ж ладони
перекрыли дорогу ей в тыл.
Василёк край тропинки оставил:
голубую взирает мечту.
А она, как пушиночка тает,
у пригорка берёт высоту.
На травинке, у рыжей верхушки,
стрекоза в рог улитки поёт.
В клюве аиста гордо лягушка
улетела в последний полёт.
На прощанье растерянно лапкой
с высоты мне послала привет.
На душе стало чуточку зябко:
видно, это дыханье планет.
Горизонт распушился вдруг хлопком
облаков белоснежно-седых.

Дальний лес, что казался мне сопкой,
где-то прятал в хранилище их.
Пахнет спелой грозой и озоном
Штопор вихря пружиной вдали.
А над луга расцветшим газоном
чайки дождик на крыльях несли.
Прокатилась грозы колесница,
тёплой влагой июль напоив,
Смотрит Нёман в счастливые лица
золотых тяжелеющих нив.

## *Гродно*

У синих приветливых
нёманских вод,
Где ветер гуляет свободный,
И лес бесконечные песни
поёт,
Мой город стоит –
славный Гродно.
Сияньем огней на бульварах
седых
К себе он манит вечерами.
Девчонок влюблённых,
шутниц озорных
Зовёт на свиданье с парнями.
А в парке эстрадный гремит,
как салют,
Фокстроты танцуются лихо,
И песни о Нёмане вольном
поют
Табачник с весёлой ткачихой.

Ловлю позывные составов
крутых,
Везущих целебные туки.
Прости меня, Господи,
к лику святых
Причислю рабочие руки.
Что сделали сказочным
город родной,
Дыханьем заводов согрели,
В сады с гомонящей
зелёной листвой
тепло, по-отцовски, одели.
Живёт Беларусь – и мой город живёт,
И ветром мы дышим
свободы.
Я рад, что на твой переведены
счёт
И юность, и лучшие годы.

## *Граница*

Застыла граница
В молчаньи немом.
Вот-вот разразится
И грянет здесь гром.
Вот-вот разразится:
Разведка точна.
Депеша ложится,
Что завтра война.
Все знали, но правда
Ушла под печать.
На выстрелы надо

Границе молчать.
Граница, ты – нервы!
Ты – совесть страны!
Июнь. Сорок первый...
В дозоре сыны.
На юные жизни
Отточен уж меч,
Во имя Отчизны
Им велено лечь.
Граница, граница,
На карте ты – в нить,
Хочу поклониться,
Что выпало жить...
Туман над каналом,
Не видно ни зги.
Сувалки – направо,
Налево – Брузги.
Заставы, заставы –
Страна за спиной!
Бой приняли правый
С Европой стальной.
Граница пылает,
Но бьёт пулемёт:
Застава стреляет,
А значит, живёт!
Три раны под сердцем,
Немеет плечо.
Уходит в бессмертье
Старлей Сивачёв.
В дыму Августово,
Захвачен канал,
Но слышится снова
Там боя накал.

Бьёт снайпер Сорока,
Шабарин строчит...
И вот одиноко
застава молчит.
Полоскою узкой
Зарделся песок,
Немеет у Усова
Смертный висок.
Упал Кириченко
В горящих лесах,
Даргунь, деревенька,
Заставу спасай!
Горела застава,
Да как не гореть?
Имея лишь право
Одно – умереть!
И право использовав
То до конца,
Покрытые бронзой,
Застыли сердца!
На улице личной,
Как раньше в бою,
Стоят пограничники
В мощном строю.
Из бронзы и стали –
Такая им честь –
Навечно здесь встали,
Здесь службу им несть!
И город влюблёно
читает им стих.
Страна поимённо
Приветствует их...

## Ірына ВОЙТКА

### *Я ў Гародні*

Я ў Гародні , я ў Гародні –
і шчаслівая я сёння!
Я да Нёмана ў госці
зноў іду па Новым мосце.
Старажытную Каложу
так паважна я праходжу.
І ў парку Жылібера
Пачастую качак шэрых.
Новы замак пад гарою
стрэне вежай-галовою.
І на Фарным на касцёле
на гадзіннік, часу кола,
пазіраю і дзіўлюся,
і далей па вулках рушу.
Вулкі-вулачкі Гародні,
як ўтульна з вамі сёння.
Новы горад і стары,
у палон мяне бяры.
Старажытная Гародня,
тут шчаслівая я сёння!

завіт

## *Мой Гродно*

Мой Гродно, мой Нёман, мой кут…
В объятьях озёр и лесов.
Берёзки, каштаны растут,
Ты – пристань для белых буслов.

Люблю тебя ночью и днём,
Когда колокольни звонят.
В Коложе твой лик сохранён,
Историю камни хранят.

Всегда ты покой сторожил,
Святые твои купола.
Ты юн, хоть уже старожил,
В твой адрес от всех нас – хвала!

Мой город, расти и взрослей!
Сил даст тебе Нёман седой.
Мой город цветов и аллей,
Фонтанов с поющей водой.

Соборов златые кресты,
Я верю, покой наш хранят.
Проспекты, бульвары, мосты
В счастливое завтра манят.

## Благодарность

Я о Гродно вам песню спою,
Пусть летит она в синие дали.
У флагштока любуюсь-стою
На его ордена и медали.

Так держать, Гродно, друг-ветеран!
За тебя буду в храме молиться.
На себя возьму боль твоих ран,
Твёрдый шаг пусть навек сохранится.

Для меня ты – обитель, мой дом,
И пою тебе песни об этом…
След оставлю стихами, трудом –
Только здесь стал однажды поэтом.

Радость творчества здесь я познал,
Благодарен тебе я по праву.
Что ты принял меня, обласкал,
Будто белые росы на травах.

Покр собор

## *Моему городу*

Ты так красив в мозаике огней,
Старинный город, мой вечерний Гродно.
С годами мы становимся родней,
Уж так судьбе, наверное, угодно.

И улицы, и площади давно
До мелочей привычны и знакомы.
Есть города крупней и краше, но
Милее нет! Лишь только здесь я дома.

Ты дорог мне, и я тебя люблю
И в час цветения, и в непогоду.
Вновь фотообъективом я ловлю,
Как гордый Нёман катит свои воды.

В годы войны ты выстоял, ты смог
Моей страны стать яркою страницей.
Ах, Гродно! Мой родимый уголок,
Ты мой причал, моей души частица!

## *Гродно*

Среди родных принёманских просторов
Красуется, как каменный цветок,
В садах весенних розовым узором
Мой Гродно, сердцу милый уголок.

Над ним встают весёлые рассветы,
Лучом касаясь древних куполов.
Дома и улицы теплом согреты,
И рыбаки несут ночной улов.

Давным-давно здесь наши предки жили,
Мудры, трудолюбивы и горды.
Защитный вал из камня возводили,
Чтобы сегодня жили я и ты.

Переплелось былое с настоящим:
И драмтеатр, и замки королей…
Мой Гродно, ты под солнышком палящим
Ещё уютнее, ещё милей.

Фасады новых зданий, магазинов,
Фарный костёл и обновлённый парк,
Эффектная Швейцарская долина,
Мост над рекой, Коложа, зоопарк.

О город Гродно, сторона родная,
Любовь к тебе во мне – на все года.
В огромном мире нет дороже края,
С тобою мы едины навсегда!

## Святочны Гродна

*Да свята нацыянальных культур*

Па Гродна крочыць фестываль,
Усюды звонкі смех і песні,
Шары і птушкі ў паднябессі:
У горадзе святочны баль.

Сардэчна сустракаюць тут
Армян, эстонцаў, венграў, рускіх…
На нашых вулках беларускіх
Гамоніць і жартуе люд.

А на падворках, што ні стол –
Гасцінцы розныя, прысмакі…
Пах шашлыка і кулебякі
Ў паветры лётае наўкол.

Спакусіць сувенірны рад:
Карціны, кошыкі, сурвэткі,
Магніцікі, з саломкі кветкі –
Народных вырабаў парад.

Зайграла скрыпачка ў цыган,
Грузіны кінуліся ў скокі,
Падворак блізкі і далёкі
Гучыць, як велічны арган.

Праз два гады ізноў да нас
Замежныя прыедуць госці.
І пры сустрэчы скажа хтосьці:
– Сябры, вітаем шчыра вас!

## Вуліцы Гродна

Хаджу па вуліцах Гародні
І ў думках паўтараю зноў:
– Мой горад, ты такі мне родны,
І ў сэрцы да цябе любоў.

Утульны, ветлівы, прыгожы,
Знаёмы змалку, дарагі:
Тут драмтэатр, царква Каложа,
Прынёманскія берагі.

Ты з кожным годам маладзееш,
Мужнееш на маіх вачах,
Садамі майскімі квітнееш
І пашыраешся ў плячах.

Таму люблю зімой і летам
Па вулках гродзенскіх гуляць.
Пакуль з'яўляюся паэтам,
Край родны буду праслаўляць!

уліцы гродно

## Наталля ЦВІРКА

### *Гродна*

Нібы дыямент у кароне Радзімы,
Ты ззяеш святлом непаўторным заўжды.
О Гродна, цудоўны і ўсімі любімы!
Прыводзяць дарогі няхай нас сюды.

Тут Нёмана хвалі, старая Каложа,
Гадзіннік на плошчы адмервае час.
Забыць гэты горад ніхто ўжо не зможа,
Калі прыгажосць яго ўбачыў хоць раз.

На вуліцах Гродна сівыя стагоддзі
Нібы ажываюць, гавораць без слоў.
Мінулае тут і сучаснасць у згодзе.
Тут кожны каменьчык пяе пра любоў.

Тут рады гасцям, фестываль тут цудоўны
Збірае далёкіх і блізкіх сяброў.
Вітаюць так шчыра, і ў песні чароўнай
Суквецце сяброўскіх гучыць галасоў.

Нібы дыямент у кароне Радзімы,
На радасць усім ты квітней праз гады!
О Гродна, цудоўны і ўсімі любімы,
Прыводзяць дарогі няхай нас сюды.

## Восень у Гародні

На вуліцах Гародні восень
Малюе фарбай залатой,
А птушкі ўдаль цяпло адносяць,
Каб нам вярнуць яго вясной.

У яркім восеньскім убранні
Нябачны прытаіўся сум.
Гародня наша – у чаканні,
І сцішыўся, спыніўся тлум.

Вакол, нібыта – урачыстасць,
Таму ўрачыста  на душы.
У восеньскім святле іскрыстым
Як на далоні, свет ляжыць.

## Каложа

У памяці тваёй, Каложа,
Сівых стагоддзяў карагод.
О, колькі расказаць ты можаш!
О, колькі бачыла ўсяго!

Плылі падзеі, нібы хвалі
Старога Нёмна, прад табой.
А ты ва ўсе часы стаяла
Над гэтай мудраю ракой.

Ты – сімвал горада, ты – веліч.
З мінулых так пайшло гадоў.
Мы Бога просім тут аб вечным
І пра надзённую любоў.

***

Горад-казка, горад-песня –
Гэта Гродна наш бясспрэчна!
Нібы сонца, у сэрцы  ззяе
І заўсёды нас чакае.
Гродна – дзіваў розных поўны,
Лепшы ў свеце, непаўторны,
Старажытны і сучасны…
Дык квітней пад небам ясным!

Гродно

## Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ

### *Восень ля Каложы*

Па Гародні крочыла
восень ціхім ранкам.
Песеньку спявала
ёй Гараднічанка.
У Каложскім парку
госця затрымалася.
Дрэвам экзатычным
сонечна ўсміхалася.
Ім дарыла вопратку,
казачную, новую,
вышытую золатам,
стразамі барвовымі.
У букетах восеньскіх –
дзіўная Каложа,
а ў нябёсах цешыцца
ўсемагутны Божа.

р-тное фото

## *Зімка-чараўніца*

Зімка-чараўніца
па Гародні мчыцца,
У пухнатым белым футры,
белых рукавіцах.
А з карункавых сняжынак
начапіла завушніцы.
Шапку белую надзела –
і навокал пасвятлела.
Полем, лесам танцавала,
дыяменты рассыпала.
Ды паклікала наранку:
– Гэй, дзятва, хутчэй на санкі!
Мы дасталі снегакаты,
лыжы і канькі…
У чароўны лес зімовы
крочым у Пышкі.
А з гары разносяцца
гучны смех і гоман.
Толькі спіць пад лёдам
непрабудна Нёман.

## Таццяна СУЧКОВА

### *Горад прачынаецца*

Ранкам горад прачынаецца,
Сонца ў Нёмане купаецца,
Яно ў срэбранай вадзіцы,
Нібы рыбка, весяліцца.
Гродна ў зелені густой
З ранку мыецца расой.
Чайкі на ваду садзяцца,
Плёскаюцца, весяляцца
У вадзе рачной, халоднай.
Добрай раніцы, мой Гродна!

### *Сладкий город*

На Земле есть город сладкий,
Здесь дома, как шоколадки,
Светятся в обвёртках ярких.
Всюду сказочные парки,
Облака из сладкой ваты
Кружат в небе розоватом.
Расцветают в зорях алых
Мармеладные кварталы.
А под солнышком румяным
Замки, словно марципаны,
Блещут в звёздах лучезарных,
А театр, как торт шикарный.
Кремовый дворец элитный,
С пышной лестницей бисквитной.
Купола тут из зефира,

Сад волшебный из пломбира.
Мчатся вихрем, крутят шины
Шоколадные машины.
Из фонтанов брызжет ловко,
Рассыпаясь, газировка.
Сладкие мосты-подковы,
Нёман в звёздах леденцовых,
Звёздный блеск речной глазури,
Берег в сахарном ажуре.
Между сосен и рябинок
Нити сахарных тропинок.
Завораживает снова
Ассорти цветов медовых,
И на клумбах разноцветных,
Словно вкусные конфеты.
Куст, как чупа-чупс, над речкой,
А сосна медовой свечкой
В небе солнце зажигает,
Сладкий город оживает.
В Сладком городе мечты,
Шоколадные цветы,
Каланча из пастилы,
Даже сладкие балы.
Мармеладные дорожки,
Леденцовые окошки.
Тут балконы все резные,
И качели золотые.
В самом сладком зоопарке,
Попугай на ветке яркий,
Зубр гуляет шоколадный,
Кружит аист мармеладный.

Отправляясь в сладкий путь,
Так и хочется лизнуть
Шоколадную травинку
И медовую росинку.
А по сахарной аллее
Прогуляться веселее,
На малиновой дорожке
Встретить сахарную кошку.
В сладком городе чудесном,
Жить, как в сказке, интересно.
Рада городу планета,
Сладкий Гродно – чудо света!

## *Гродно – радужный город*

Гродно радужный в красках искрится,
Дней бегущих листая страницы.
Словно радуга, город весёлый,
Как мозаика, в зелени школы.
Разноцветье домов восхищает,
Нёман в пышных лесах утопает.
Город радужный шлёт настроенье,
Удивляет в саду птичье пенье.
Город солнечный в ярких полосках,
Утопает в каштанах, берёзках…
Словно радуга, светится ярко,
Над рекой замки в радужном парке:
Золотыми огнями сияют,
Заглянуть в рай земной приглашают.
В куполах солнца луч заискрился,
Словно ангел на землю спустился.
Телевышка взметнулась, как стрелка,
И театр неземною тарелкой,

Над горой возвышается гордо.
Мчит олень в небеса – символ Гродно.
Вьются, улицы, вдаль убегая,
И троллейбусы всюду мелькают.
А в деревьях дома разбежались,
В кружевах облаков затерялись.
Милый город, он радужный самый,
Будто в фантиках, в пёстрых рекламах.
Звонкий смех детворы не смолкает,
Доброта горожан удивляет.
Своды арок, резные балконы,
В храме Божьем – святые иконы.
Гродно – город загадка и тайна,
Каждый дом восхищает дизайном.
Куполов звёздный блеск разливая,
Красотой неземной покоряет.
Ярким танцем и песней весёлой
И величием в сквере костёла.
Удивляют резные скульптуры,
И повис над рекой сад ажурный.
Здесь народ любит труд. И задорный,
Тёплый город чудесный, просторный,
Рад гостям, добродушен, открытый,
Город богом любим, незабытый.
В разноцветных узорах фасады,
Бесконечно сменяя наряды,
Остаётся роскошным и модным,
Пережив радость лет и невзгоды.
Над мостом, как старинное диво,
Каланча смотрит в небо игриво,
А над ней облака, как ромашки,
Чистый город с душой нараспашку.
Город-радуга в солнечных красках,
Гродно радужный – вечная сказка!!!

## Таццяна ЯЦУК

### *Ґродна*

Дні адлятаюць, нібы птушкі ў вырай
За небасхіл, за даўнія муры,
А Гродна з незабыўнае пары
Над Нёманам лунае вечна-шчыра.

Гісторыя жыве ў магніце вулак,
Гасцінна кліча ў калаўрот падзей,
Дзе белыя гарлачыкі надзей
Ля замка старажытнага прыснулі.

Спакойна так блукаць у цішыні,
Сярод раскошы аднаўляць падзеі.
Гісторыяй ад кожнай цэглы вее,
Мінуўшчыны ўспамінам пласт крані.

Намолена зямля святою верай
І праўдаю прашыта векавой.
Там дабрачыннасць постаццю святой
Ідзе па сцежцы мудрага даверу.

У горадзе шчыруе фестываль,
У згодзе ўсе канфесіі, народы,
І дух няўмольны волі і свабоды
Жыве ў суладдзі неспакойных хваль.

## *На ўзбярэжжы Нёмана*

У шчырым летуценні на ўзбярэжжы
Я памаўчу пад ціхі спеў ракі,
Ткуць павучкі на гладзі вод мярэжы,
А ў травах каля рэчкі – светлячкі.

Заканамерна Нёман хвалі коціць,
У задуменнай  глыбіні ракі,
І ў радасці, і ў сцішанай сумоце
Гуляюць мітуслівa шчупакі.

У іх адна спрадвечная турбота:
Свабодна плаваць у раскошы вод,
І дзень згасае стоенай маркотай –
І заціхае стос яго турбот.

Пяюць асокі аб сваім, спрадвечным –
Такі адпрацаваны дзеяў ход.
І адыходзіць час няспешна ў вечнасць –
І круцяць хвалі часу калаўрот.

Пад ціхі спеў твой, Нёман векавечны,
Імгненна падымаецца настрой,
І лечыць сэрца шчырая сардэчнасць,
Душу палоніць велічны спакой.

## Татьяна ЛАШУК

### *Коложская тишина*

Тишина над рекой, как молитва природы,
Даже ветер в листве приглушённый и кроткий.
От коложских крестов отражаются годы,
Здесь столетья звучат, как Господние чётки.
Сокровенное сердце святынь Беларуси,
Старый храм, будто лев, смотрит в Нёман над
кручей,
Время шрам нанесло, но он вынес, не струсив,
В битвах зла и добра, словно витязь могучий.

### *Мой Гродно*

В него нельзя навеки не влюбиться:
В нём жизни пульс, душа и красота.
Мой Гродно это – молодые лица,
Мой город – древних храмов высота.

В Коложском парке распевают птицы,
Мелькнёт вдали невестина фата.
Зовёт гулять, мечтать, не торопиться
Уютных улиц свет и чистота.

Здесь оживут истории страницы,
Повсюду знаки, прошлого лета,
Здесь вдохновенье семи муз родится:
Ожешко, Бакста, Быкова места.

Твой синий герб в грядущий век стремится:
В прыжке оленя – мысли быстрота.
Мой Гродно – это Нёмана столица,
Мой город – это дома теплота.

## *Фестываль над Нёманам*

Кожны дзень у Гароднi –
падарунак Гасподнi.
Тут лячуся душою
мiж сваiх землякоў,
Каранi ўглыб пускаю
i ў раздоллi гушкаю
Мары-думкi без межаў,
i нiякiх акоў.

У Швейцарскай далiне
даўнi смутак пакiну
Абмываць у рачулцы,
што цячэ тут здавён.
З маладым Жылiберам
пабратаюся ў веры,
Да якой праз стагоддзi
далучыў мяне ён.

Гэта вера ў Гародню,
што на “крэсах усходнiх”
Не скарылася волi
нi паноў, нi гаспод.
I сягоння шыкоўна
ў шматгалоссi прыстойным
Зноў сабрала на свята
беларускi народ.

Ах, які ён шматлікі!
Грайце, грайце, музыкі,
Біце ў бубны і боны,
час вяселля – для ўсіх!
Малдаванін, татарын,
і таджык, і балгарын,
Беларус і карэец
тут вітаюцца ўслых.

У гасцях у рамалаў
весялосці нямала
Ў віхры танцаў цыганскіх –
жар качэўнай любві!
І гуляе, не стыне
ў беларускіх грузінаў
Тэмперамент усходні –
у гарачай крыві.

Ля анёла, на ганку, –
у рытме – свет індыянкі,
ёю зачараваны
гаспадар не адзін.
Тут свае маюць дзеі
ўкраінцы, яўрэі,
Запрашаюць да кухні
рускі і армянін.

На падворку рамёстваў
рэчаў зроблена мноства –
Беларускіх, прыгожых, –
як жа іх не набыць!
Горад дружны заходні –
Гараднiца, Гародня,
Наша роднае Гродна,
як цябе не любіць!

## *Сярод гарадзенскіх паэтаў*

У пісьменніцкім асяродку
Адпачыла наўздзіў салодка,
Узлятаюць да неба думы
І ратуюць ад злога тлуму.

Як жа мала і мне патрэбна,
Каб заззяла, як месяц, срэбра
У пярсцёнку і завушніцах,
Калі маю чым захапіцца.

Захапляюся вечным летам,
Што даруе душа паэта,
Непадкупнаю верай мэтра,
Што заслоніць мяне ад ветру.

Захапляюся славай тою,
Што паэт падзяліў са мною,
Ад якой палымнее сэрца,
Спапяляючы цені смерці.

Захапляюся прадчуваннем,
Не дарма што даецца званне,
Блаславёнае Божым светам,
Гарадзенкай быць і паэтам.

## *Лісты да гарадзенца*

*трыпціх*

**- 1 -**

Ты мовы ведаеш суседзяў,
пажыў за морам, а цяпер
гараднічаначку нагледзеў,
дык сэрца ёй сваё давер.

Давер пачуцці і жаданні,
гадоў імклівых карагод.
і ўбачыш,  як яе каханне
цябе ўратуе ад нягод.

Ды падаруе слодыч шчасця
і загартуе твой імпэт.
Як хвалі мора, сціхнуць страсці,
як мірны востраў, стане свет.

Падай руку сваю – наперад,
гараднічаначцы сваёй.
Яна ў цябе жадае верыць.
Яна – з табой.

**- 2 -**

І я без цябе “драбнею”,
мой сябар, пяшчотны самы.
А іншаю быць не ўмею,
як гродзенскаю таксама.

Такі вось імпэт зямляцкі:
калі ўжо кахаць, то шчыра.
Давай пасядзім па-брацку,
яшчэ нам зарана ў вырай.

Сяброўкі твае крыўдуюць –
цябе ж ад усіх я ўкрала,
нібы знайшла залатую
пражылку, а іх не звала.

І ты мне "падсыпаў перцу":
– Няма чаго азірацца!..
Жалейкаю плача сэрца,
не створанае змагацца.

**- 3 -**

Адраджаюся думкамі
для чарговай вясны.
Прыйдзеш ты з падарункамі,
без віны і маны.

Успамінам з Гародні
растаплю я свой лёд.
Прашапчу: – Мой ты родны,
я – не сон і не мёд.

Распляту косы чорныя
ды да белых плячэй.
Стануць самыя зорныя
нашы ночы з начэй.

## *Птушкай над горадам*

Хочацца лётаць над горадам ціхім,
ветрам аблашчаным, сонцам сагрэтым.
Хочацца птушкай адчуць сябе крыху
ў час развітання з “бабіным летам”.

Выпрастаць крылы, не знаючы страху,
зверху аглядваць двары і будынкі,
шэрыя, сінія, рыжыя дахі,
цэрквы і крамы, палацы і рынкі.

Дзіўным і лёгкім хваліцца палётам
перад вялікай грамадай аблокаў,
і не даводзіць нікому пра “хто ты”,
неператрэсваць забытыя ўрокі.

Хочацца лётаць свабодна, шчасліва,
зверху аглядваць зямныя палотны,
недатыкальна і лёгка на дзіва,
не памылкова і не гаротна.

Без асаблівай святочнай нагоды
хочацца лётаць проста і годна,
не парушаючы з’яваў прыроды,
над Ваўкавыскам, Скідалем, Гродна…

## *Добры дзень, горад мой!*

*Словы Т. Мазур*
*Музыка Я. Петрашэвіча*

Сустракае Гародня
сонца светлыя промні.
Я тулюся душою
да сваіх землякоў –
Шчыра песню спяваю
толькі роднаму краю.
Ты прымі, родны горад,
пашану, любоў.

*Прыпеў:*
Добры дзень, горад мой.
Ты прымі, родны горад,
пашану, любоў.

Прыгажун сіні Нёман
мне з дзяцінства знаёмы.
На ўзвышшы Каложа
зберагае твой лёс.
Тут жыву і кахаю,
сэрцам песню спяваю.
Родны горад мой Гродна,
любімы да слёз.

*Прыпеў:*
Добры дзень, горад мой.
Родны горад мой  Гродна,
любімы да слёз.

Помніць горад мой любы
гарадзенскія трубы.
Многа бачыў навалы
і шмат горкіх дзён.
Ты цвіцеш, маладзееш
і шануеш надзею
на шчаслівае заўтра,
на радасць і плён.

*Прыпеў:*
Добры дзень, горад мой.
На шчаслівае заўтра,
на радасць і плён!

## *Як бачыце…*

А я захавала душу
На гэтым этапе сталення.
Як бачыце, вершы пішу
Па поклічу сэрца й сумлення.

Як бачыце, веру ў сябе,
У шлях свой  на любай зямельцы,
Дзе ў радасці, як і ў журбе,
Не гасне пачуццяў цяпельца.

Як бачыце, знаю цану
І роду свайму, і Айчыне,
Што з мовай маёю адну
Ніколі мяне не пакіне.

Як бачыце, маю ў пасаг
Усе гарадзенскія храмы!
І часта маршруткай, не ў снах,
Вяртаюся ў вёску да мамы.

Як бачыце,  лёгка хаджу
Я па брукаванцы без спешкі,
Пад казачны пошчак дажджу
Па вуліцы нашай Ажэшкі.

Як бачыце, часам Максім
У госці мяне запрашае, –
Мой юны Паэт, Пілігрым, –
